# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** Акардэон. Рабчык. Лямпас. Лерка. Сяўба. Дажбог. Астра. Тунг. Кніга. Пасуда. Урон. Ламака. Альянс. **Па вертыкалі:** Мармелад. Куча. Рыкша. Насос. Краж. Ласо. Мяў. Ака. Яга. Бот. Аўт. Бандура. Натарыус. Сын. Шпала. Канал. Сума. Дока.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.06 | 21.26 | 16.20 |
| Віцебск — | 4.48 | 21.22 | 16.34 |
| Магілёў — | 4.56 | 21.16 | 16.20 |
| Гомель — | 5.00 | 21.04 | 16.04 |
| Гродна — | 5.22 | 21.39 | 16.17 |
| Брэст — | 5.31 | 21.32 | 16.01 |

### Месяц

*Маладзік 23 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

**Пр.** *Пракопа.*
**К.** *Андрэя, Віктара, Данеля.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 21 ЛІПЕНЯ

**356** год да н. э. — у ноч з 20 на 21 ліпеня Герастрат спаліў Храм Артэміды ў Эфесе — адно з сямі цудаў антычнага свету. У гэты ж дзень нарадзіўся Аляксандр Македонскі, цар Македоніі, палкаводзец, стваральнік сусветнай дзяржавы.

**1812** год — падчас Айчыннай вайны 1812 г. каля вёскі Салтанаўка, за 12 км на поўдзень ад Магілёва, пачалася жорсткая бітва паміж палкамі 7-га пяхотнага корпуса генерала Раеўскага і французскімі войскамі корпуса маршала Даву. Дзеянні корпуса Раеўскага скавалі сілы саперніка і забяспечылі пераправу галоўных сіл арміі Баграціёна праз Дняпро. На месцы бою ў 1912 г. пастаўлена мемарыяльная капліца, у 1962 г. устаноўлены мемарыяльныя дошкі на полі бою ў Салтанаўцы, у в. Сапежынцы Быхаўскага раёна, дзе знаходзіўся штаб 2-й рускай арміі, і ў в. Дашкоўка.



**1897** год — нарадзіўся Васіль Данілавіч Сакалоўскі (Гродзенская губерня, цяпер тэрыторыя Польшчы), савецкі ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны (1918—1920). У 1930—1935 гг. камандзір дывізіі БВА, затым у іншых ваенных акругах. Удзельнік распрацоўкі Смаленскай аперацыі (1943) і Віцебска-Аршанскай аперацыі (1944). У Гродне імем Сакалоўскага названа вуліца і ўстаноўлены бюст.

**1937** год — нарадзіўся Ігар Георгіевіч Малкоў (Украіна), беларускі інжынер-будаўнік, педагог, прафесар, доктар архітэктуры. Распрацаваў тэарэтычнае абгрунтаванне і навуковы метад планіровачнага і архітэктурна-будаўнічага фарміравання сельскіх населеных пунктаў, практычныя рэкамендацыі па архітэктурна-тэхналагічным рашэнні важных народнагаспадарчых аб'ектаў на сяле. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1940** год — камандаванне гітлераўскай Германіі пачало распрацоўку ваеннай кампаніі супраць Савецкага Саюза — «Плана Барбароса». Рашэнне Гітлера ажыццявіць аперацыю «Барбароса» стала паваротным у гісторыі Трэцяга рэйха, якое прывяло да яго краху праз чатыры гады. Пры распрацоўцы плана «Барбароса», разлічанага толькі на «маланкавую вайну», першапачаткова была дапушчана недаацэнка саперніка і не ўлічана магчымасць перарастання хуткабежнай вайны ў зацяжную.

**1947** год — нарадзіўся Барыс Міхайлавіч Хрусталёў (г. Гомель), беларускі вучоны ў галіне аэрадынамікі дысперсійных патокаў, рэсурсазберажэння і экалогіі, акадэмік НАН Беларусі (2009), доктар тэхнічных навук (1998), прафесар (1991), заслужаны работнік адукацыі Беларусі (1995). Аўтар больш як 150 навуковых прац у галіне тэорыі і аэрадынамікі дысперсных патокаў, метадалогіі праектавання апаратаў і сістэм, якія дазваляюць выкарыстоўваць рэсурсазберагальныя тэхналогіі ачысткі вентыляцыйных выкідаў, метадаў праектавання і разліку сушыльных сістэм, стварэння неабходнага мікраклімату для жыццядзейнасці чалавека.



**1983** год — на антарктычнай станцыі «Усход» была зафіксавана самая нізкая тэмпература на планеце за ўсю гісторыю назірання -89,2 °С.

### Было сказана

**Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:**
*«Агню без цемры цемнавата,*
*Не цёмна цемры без агню...»*

## УСМІХНЕМСЯ

У паліклініцы.
— Хворы, вам штодня трэба выпіваць шклянку соку са свежааддзіснутых апельсінаў, з'ядаць два ківі, кавалачак ананаса і авакада.
— Доктар, а ўсё гэта пад гарэлку можна?

**Аб'ява:**
**«За невялікае ўзнагароджанне прыскачу да вашага пад'езда на белым кані і ў касцюме прынца, бабулькам каля пад'езда скажу, што па вас».**

Жанчына можа вельмі доўга глядзець на тры рэчы...
А ў выніку купіць дзевяць!

**Толькі ў фільмах у канцы прыходзіць мужык і вырашае ўсе праблемы. У жыцці ўсё наадварот: мужык з'яўляецца ў пачатку, і з яго пачынаюцца ўсе праблемы.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2669.
Нумар падпісаны ў 19.30 20 ліпеня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12